ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 15 (989) | АЎТОРАК, 24 кастрычніка 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

**Да вынікаў выбараў**

## ДАСТОЙНЫХ НАЗВАЛІ НА ГАЛАСАВАННІ

15-га кастрычніка праходзілі выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. На тэрыторыі дзвюх выбарчых акруг — Гомельскай-Юбілейнай № 33, Гомельскай-Цэнтральнай № 35, дзе размяшчаюцца вучэбныя карпусы і інтэрнаты ГДУ, удзел у галасаванні прымалі нашы выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты. Пераважная большасць з іх праявілі высокую грамадзянскую свядомасць і актыўнасць у палітычным дзяржаўным мерапрыемстве. Гэта было засведчана і на выбарчых участках № 23 і № 28, якія працавалі адпаведна ў вучэбных карпусах № 1 і № 2. Іх выбарчымі камісіямі было зроблена ўсё неабходнае, каб галасаванне прайшло на належным узроўні, без істотных заўваг.

За дэпутацкі мандат па Гомельскай-Юбілейнай № 33 выбарчай акрузе змагаліся шэсць прэтэндэнтаў, у тым ліку і прафесар геолага-геаграфічнага факультэта нашага універсітэта А.П.Пінчук. Тут найбольшую колькасць галасоў набралі намеснік упраўляючага дзяржаўным прадпрыемствам "Трэст Гомельсаўгасбуд" С.Д.Калеснікаў і галоўны рэдактар газеты "Гомельская праўда" В.М.Логвін. Хто з іх стане членам беларускага парламента, вызначыцца ў другім туры галасавання.

Па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 35, па якой балаціравалася тры кандыдаты ў дэпутаты, пераможцам ужо ў першым туры галасавання стаў кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля У.І.Дзервянкоў, які па набраных галасах значна апярэдзіў сваіх канкурэнтаў.

## НАВУКА І АДУКАЦЫЯ НА ПАРОЗЕ III-ГА ТЫСЯЧАГОДДЗЯ

Пад такой назвай у г.Мінску прайшоў Міжнародны кангрэс, арганізатарамі якога з'явіліся ЮНЕСКА, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Міністэрства адукацыі РБ, Расійская акадэмія навук, Міністэрства адукацыі Расійскай Федэрацыі, Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі.

У рабоце кангрэса прынялі ўдзел вучоныя і практыкі з краін былога СССР, а таксама далёкага замежжа — ЗША, Бразіліі, Італіі, Індыі, Балгарыі, Югаславіі, Германіі і інш.

На 14 секцыях кангрэса абмеркаваны і заслуханы даклады па самых розных аспектах навукі і адукацыі. Падкрэслівалася, што навука — з'ява адкрытая, і супрацоўніцтва ў гэтай галіне мае шырокія перспектывы. Удзельнікамі кангрэса прааналізаваны таксама перспектывы развіцця міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі ў рамках СНД і іншых краін. Вялася зацікаўленая размова аб інтэграцыі універсітэцкай навукі ў сусветны навуковы працэс, аб гібкай сістэме інтэрнацыяналізацыі навукі і медыцынскай адукацыі, аб рэформе вышэйшай адукацыі і ўдасканальванні падрыхтоўкі настаўнікаў у кантэксце сусветных тэндэнцый адукацыі, аб гуманістычнай накіраванасці працэсаў навучання і інш.

Ад нашага універсітэта ў рабоце Міжнароднага кангрэса прыняў ўдзел прарэктар па культурна-асветніцкай і выхаваўчай рабоце А.В.Лысянкоў; у секцыях "Актуальныя праблемы трансфармацыі адукацыі", "Гуманітарызацыя навукі і адукацыі — тэндэнцыя XXI стагоддзя", "Нацыянальныя традыцыі, культура і адзінства адукацыйнай прасторы" з дакладамі выступілі прафесар У.М. Калмыкоў, ст. выкладчык Я.А.Броўкін, дацэнт В.С.Новак, ст.выкладчык Т.В.Аўдоніна.

## ЗА ЧЫСЦІНЮ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

Наша газета паведамляла ўжо аб супрацоўніцве ГДУ з Рэчыцкім гарадскім выканаўчым камітэтам. Нядаўна адбылася яшчэ адна, сумесна наладжаная акцыя — прыём дэлегацыі шведскага горада Трэлеборга. Выбар шведскім бокам Рэчыцы быў абумоўлены блізкасцю прыродных і эканамічных умоў двух гарадоў — блізкасць вадаёмаў, наяўнасць сельскагаспадарчай і лясной акруг, а таксама родныасных вытворчасцей, што здольны ствараць небяспеку для навакольнага асяроддзя. Акрамя свайго горада, шведская дэлегацыя адначасова прадстаўляла дзве міжнародныя структуры — падпісаную ў мінулым годзе ў Рыа-дэ-Жанейра міжнародную праграму дзеянняў за экалагічную бяспеку ў XXI стагоддзі "Агенда — 21", а таксама Саюз гарадоў Балтыі, дзейнасць якога ў значнай ступені мае экалагічную накіраванасць. Дарэчы, Беларусь, як краіна Балтыйскага рэгіёна, мае права прадставіць у гэтым Саюзе 3 свае гарады. Заявы на ўступленне ў яго падалі ўжо Гродна і Віцебск, не выключана, што трэцім горадам можа быць і Рэчыца альбо Гомель.

Дэлегацыя ўзначальвалася мэрам г.Трэлеборга і складалася з 9 чалавек, якія прадстаўлялі муніцыпалітэт, палітычныя, грамадскія і маладзёжныя арганізацыі, якія маюць прычыннасць і зацікаўленасць ў вырашэнні экалагічных праблем.

У рамках праграмы візіта быў наладжаны прыём у рэктараце ГДУ, дзе рэктар прафесар М.В. Селькін пазнаёміў гасцей з вучэбнай і навуковай работай універсітэта, яго магчымасцямі ўдзелу ў вырашэнні экалагічных праблем.

Асноўную частку праграмы заняла работа семінара, які праходзіў 2 дні ў маляўнічай мясціне пад Рэчыцай — базе адпачынку "Мілаград".

Кола ўдзельнікаў семінара было даволі шырокім — акрамя гасцей імі сталі прадстаўнікі Рэчыцкага гарвыканкама, раённых службаў аховы навакольнага асяроддзя, санітарна-медыцынскіх і навучальных устаноў, маладзёжных арганізацый, кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў, а таксама рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Фонд імя Льва Сапегі", які дапамог наладжванню сувязей паміж Рэчыцай і Трэлеборгам.

Ад нашага універсітэта ўдзел у рабоце семінара прынялі прарэктар па навуковай рабоце прафесар Дз.Р.Лін, загадчык кафедры экалогіі А.М.Кусянкоў і аўтар гэтых радкоў.

Адбыўся даволі інтэнсіўны абмен інфармацыяй аб экалагічных праблемах тэхнагеннага паходжання ў абодвух рэгіёнах, вопыце іх вырашэння бакамі. Для Трэлеборга — гэта, найперш, небяспека забруджвання паветра і вады вялікім марскім портам, старымі прамысловымі прадпрыемствамі. Член дэлегацыі Будзіл Франке Ольсан, дэпутат шведскага парламента ад партыі зялёных, распавяла аб праграме "Агенда — 21", дзейнасці Саюза гарадоў Балтыі, узаемадзеянні цэнтральных уладаў з мясцовымі адміністрацыямі і грамадскімі сіламі ў вырашэнні экалагічных праблем.

Удзельнікі з беларускага боку азнаемілі гасцей з экалагічнай сітуацыяй у рэгіене, на якую ўплываюць некалькі фактараў небяспекі: прамысловыя прадпрыемствы (для Рэчыцы — найперш дрэваапрацоўчы і гідролізны заводы), здабыча нафты ў раёне, а таксама наступствы Чарнобыльскай катастрофы.

Грунтоўныя паведамленні зрабілі на семінары прадстаўнікі універсітэта А.М.Кусянкоў і Дз.Р.Лін.

Была дасягнута дамоўленасць аб працягу кантактаў і падрыхтоўцы канкрэтных сумесных праграм, у тым ліку і навукова-культурных.

**В.ЛЕБЕДЗЕВА,**
**ст.выкладчык кафедры беларускай культуры.**



**Пры наведванні шведскай дэлегацыяй універсітэцкага музея Ф.Скарыны мэр г.Трэлеборга Эгіль Аль (справа) у прысутнасці рэктара М.В.Селькіна (у цэнтры) і дырэктара музея К.С.Усовіча зрабіў запіс у Кнізе водгукаў ганаровых гасцей.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

*Напярэдадні падзеі*

## МАЛЯЎНІЧАЯ ПАЛІТРА ФЕСТЫВАЛЮ

***Праз два дні адкрываецца Міжнародны маладзёжны фестываль "Арт-сесія, Гомель-2000". На гэты раз ён будзе больш шырокамаштабным, чым тры папярэднія. Падрабязней расказаць чытачам нашай газеты аб свяце мастацтва і дружбы рэдакцыя папрасіла прарэктара ГДУ па культурна- асветніцкай і выхаваўчай рабоце А.В.Лысянкова.***

— Перш за ўсё трэба адзначыць, што гэты фестываль выйдзе шырока са сцен нашага універсітэта: шмат мерапрыемстваў яго праграмы адбудзецца на сцэнічных пляцоўках г.Гомеля і нават вобласці. Цяпер актыўны ўдзел у ім прымуць студэнты ВНУ горада, якія прадставяць сваю навучальную ўстанову ў міжвузаўскім конкурсе "Alma mater". Канцэрты і конкурсы будуць праходзіць у абласным драматычным тэатры (там адбудзецца ўрачыстае адкрыццё фестывалю), у гарадскім цэнтры культуры і адпачынку па вуліцы Першамайскай, грамадска-культурным цэнтры, у актавых залах ВНУ горада, у культурным цэнтры універсітэта "Юбілейны".

Сёлета на фестываль прыязджаюць калектывы і выканаўцы з краін блізкага і далёкага замежжа — Расіі, Украіны, Шатландыі, Кітая, Швецыі, Германіі, Даніі, Латвіі, а таксама розных гарадоў нашай рэспублікі. Сярод удзельнікаў "Арт-сесіі" ёсць ужо знаёмыя універсітэцкім гледачам выканаўцы, якія прыязджалі ў Гомель раней.

Фестывальны карагод цяпер значна пашырыць свае межы да такіх гарадоў Гомельшчыны як Мазыр, Жлобін, Рэчыца, яго творчыя хвалі дасягнуць таксама Добрушскага і Веткаўскага раёнаў.

Асноўны глядач канцэртных праграм, канешне ж, студэнцкая і навучэнцкая моладзь, але не будуць на гэты раз абдзелены ўвагай працоўныя калектывы прадпрыемстваў горада, якія змаглі аказаць матэрыяльную дапамогу ў арганізацыі "Арт-сесіі".

Выступленні ўдзельнікаў фестывалю адбудуцца таксама ў сярэдніх навучальных установах г.Гомеля — вучылішчы мастацкіх народных промыслаў, музычна-педагагічным каледжы імя Л.С.Выгоцкага, каледжы мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага.

Фестываль умоўна складаецца з дзвюх частак: непасрэдна сама "Арт-сесія", якая ўключае музычныя і харэаграфічныя жанры, а таксама "Арт-галерэя", у рамках якой адбудуцца сустрэчы з кампазітарамі, паэтамі, мастакамі, паказ калекцый адзення маладых мадэльераў. Упершыню будзе прадстаўлены і такі пакуль незнаёмы для многіх жанр як бодзі-арт. Запланаваны таксама фестываль бардаўскай песні, конкурс аўтараў тэлевізійных праграм для моладзі, цікавая фотавыстава, на якой будзе прадстаўлены творчы праект "Адбітак стагоддзя".

Яшчэ ў 1994 годзе наш універсітэт стаяў ля вытокаў фестывалю "Арт-сесія", быў яго ініцыятарам і ідэйным натхняльнікам. У той час ГДУ неабходную дапамогу ў яго арганізацыі аказвалі мясцовыя і рэспубліканскія ўлады. Разумеючы важнасць гэтага маштабнага мерапрыемства для нашага абласнога цэнтра, зараз больш значную падтрымку аказалі ГДУ Дзяржаўны камітэт па справах моладзі, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскія аблвыканкам і гарвыканкам, найбольш буйныя маладзёжныя арганізацыі.

Спадзяемся, што маляўнічая і разнастайная палітра фестывалю задаволіць патрабавальныя густы аматараў як фальклорнага, так і сучаснага мастацтва.

## З узнагародай!

За дасягнутыя поспехі ў вучэбна-метадычнай і трэнерскай рабоце Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны ст.выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту **ГАЛАВАЧ** Уладзімір Аляксандравіч.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны загадчык кафедры ЭІ і АСК дацэнт **ГАВЕЙКА** Сяргей Мікалаевіч.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана ст.выкладчык кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў **ВАЙЦІШКІНА** Аляксандра Лаўрэнцьеўна.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую вучэбна-метадычную і навуковую работу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана дацэнт кафедры беларускай мовы **БАГАМОЛЬНІКАВА** Наталля Аляксееўна.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры оптыкі **ШОЛАХ** Валянціна Рыгораўна і ст.выкладчык гэтай жа кафедры **КАНДРАЦЕНКА** Уладзімір Іванавіч.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана вядучы лабарант кафедры эканомікі і кіравання **ПАПКОВА** Святлана Васільеўна.

⋄⋄⋄

За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 55-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана машыністка І катэгорыі **ФЁДАРАВА** Марыя Еўдакімаўна.

## УДАСТОЕНЫ ПАДЗЯЧНЫХ ПІСЬМАЎ

За шматгадовую сумленную працу і вялікі асабісты ўклад у гісторыка-патрыятычнае выхаванне моладзі падзячных пісьмаў старшыні Гомельскага гарвыканкама А.С.Якабсона ўдастоены: загадчык кафедры філасофіі прафесар **У.М.Калмыкоў**, загадчык кафедры бухуліку, кантролю і АГД дацэнт **У.П.Бабына**, дацэнты кафедры гісторыі Беларусі **В.У.Матусевіч** і **І.Ф.Эсмантовіч**, старшы выкладчык кафедры эканомікі і кіравання **Э.І.Лізарава**.

# ПРЫСВЕЧАНА ЮБІЛЕЮ НЯМЕЦКАГА МАТЭМАТЫКА

На працягу трох дзён у нашым універсітэце працавала Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 80-гадоваму юбілею выдатнага нямецкага матэматыка Вольфганга Гашуца.

На пленарных пасяджэннях з навуковымі дакладамі выступілі доктары фізіка-матэматычных навук, прафесары – кіраўнік Гомельскай алгебраічнай школы, ганаровы рэктар ГДУ, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў, загадчык аддзела алгебры Сібірскага аддзялення Інстытута матэматыкі Расійскай акадэміі навук А.А.Махнёў, М.С.Чэрнікаў (Кіеў), М.Ц.Вараб'ёў (Віцебск), В.С.Манахаў, дацэнты У.М.Семянчук, А.Ф.Васільеў (Гомельскі дзяржуніверсітэт).

Шэраг дакладаў па гашуцавай тэорыі класаў груп і іншых алгебраічных сістэм быў заслуханы і абмеркаваны на секцыйных пасяджэннях Міжнароднай навуковай канферэнцыі.

# ДЫПЛОМЫ І ПРЭМІІ – ПЕРАМОЖЦАМ



Падведзены вынікі чарговага рэспубліканскага конкурсу на лепшую навуковую работу студэнтаў 1999 года. Ад нашага універсітэта на конкурсе было прадстаўлена 45 студэнцкіх даследаванняў.

Па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках званне "Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў 1999 года" прысвоена аўтарам навуковых работ І катэгорыі:

— выпускніцы фізічнага факультэта **В.Кандрацюк** (навуковы кіраўнік – дацэнт **В.М.Капшай**);

— студэнтцы V курса гэтага ж факультэта **Я.Патапёнак** (прафесар **І.М.Мельнічэнка**);

— выпускніцы матэматычнага факультэта **С.Дуброўскай** (ст.выкладчык **П.П.Верасовіч**);

— студэнту V курса геолага-геаграфічнага факультэта **М.Наўроцкаму** (ст.выкладчык **У.Я.Пашук**).

Названыя аўтары ўзнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 15 тысяч рублёў кожны. Навуковыя кіраўнікі таксама ўзнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 10 тысяч рублёў кожны.

Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 10 тысяч рублёў узнагароджаны аўтары навуковых работ ІІ катэгорыі:

— выпускніца біялагічнага факультэта **С.Шайко** (дацэнт **М.М.Дайнэка**);

— студэнт V курса фізічнага факультэта **В.Нікішаеў** (асістэнт **В.М.Кулічэнка**);

— выпускніца матэматычнага факультэта **А.Папова** (прафесар **І.В.Максімей**).

Загадам рэктара універсітэта іх навуковым кіраўнікам аб'яўлена падзяка.

Па гуманітарных і сацыяльна-эканамічных навуках званне "Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў 1999 года" прысвоена аўтарам навуковых работ І катэгорыі:

— выпускніцы гістарычнага факультэта **Н.Яцык** (ст.выкладчык **Я.А.Броўкін**);

— выпускніцы філалагічнага факультэта **В.Кліменка** (прафесар **У.В.Анічэнка**);

— выпускніцы філалагічнага факультэта **Ю.Сальнікавай** (дацэнт **В.К.Шынкарэнка**);

— выпускніку эканамічнага факультэта **Д.Лафетаву** (дацэнт **Т.І.Панова**);

— студэнту V курса эканамічнага факультэта **І.Шчарбакову** (дацэнт **Т.І.Панова**);

— выпускніку эканамічнага факультэта **С.Капшаю** (дацэнт **Р.Я.Кобрынскі**);

— выпускніцы эканамічнага факультэта **Т.Радзьковай** (дацэнт **Л.В.Фядосенка**).

Названыя аўтары ўзнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 15 тысяч рублёў кожны, навуковыя кіраўнікі – Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 10 тысяч рублёў за кожную навуковую работу.

Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прэміямі ў памеры 10 тысяч рублёў узнагароджаны аўтары навуковых работ ІІ катэгорыі:

— выпускнік гістарычнага факультэта **С.Жыхараў** (дацэнт **В.П.Пічукоў**);

— выпускнік гістарычнага факультэта **А.Замойскі** (дацэнт **М.І.Старавойтаў**);

— выпускнік гістарычнага факультэта **В.Каўтуноў** (асістэнт **В.Г.Яшчанка**);

— студэнт V курса гістарычнага факультэта **Я.Фурсееў** (дацэнт **З.М.Сямейных**);

— выпускнік гістарычнага факультэта **Д.Ражкоў** (ст.выкладчык **Я.А.Броўкін**);

— выпускніца філалагічнага факультэта **В.Кахоўская** (дацэнт **А.І.Цімашэнка**);

— выпускніца філалагічнага факультэта **В.Любезная** (асістэнт **Н.А.Драбышэўская**);

— выпускніца факультэта фізічнай культуры **Л.Лапіцкая** (дацэнт **У.М.Старчанка**);

— студэнт IV курса факультэта фізічнай культуры **А.Маліноўскі** (выкладчык **А.Я.Бандарэнка**);

— выпускніца філалагічнага факультэта **Ю.Драбкіна** (дацэнт **Л.Ф.Кахоўская**).

Загадам рэктара універсітэта іх навуковым кіраўнікам аб'яўлена падзяка.

Цэнтральны Савет па НДРС віншуе аўтараў навуковых работ і іх навуковых кіраўнікоў з высокімі дасягненнямі ў навуковых даследаваннях і жадае поспехаў і новых перамог удзельнікам Рэспубліканскага конкурсу 2000 года.

**А.ГАЕЎ,**
**вядучы інжынер НДС.**

**П'едэстал**

# ВУЧОНЫ, ТРЭНЕР, ПЕДАГОГ

**Нядаўна Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі ганаровае званне "Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь" было прысвоена загадчыку кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры, дэкану факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Генадзю Іванавічу Нарскіну. Высокага звання ён удастоены за развіццё фізічнай культуры і спорту, поспехі ў вучэбна-трэніровачнай і выхаваўчай рабоце па падрыхтоўцы спартсменаў высокага класа.**

Генадзь Іванавіч – гамяльчанін. Вучыўся ў СШ №4. Атрымаўшы атэстат сталасці, паступіў на факультэт фізічнай культуры ГДУ імя Ф.Скарыны. Выбар усвядомлены. А таму і вучыўся добра. Але, у адрозненне ад многіх сваіх аднакашнікаў, у час вучобы імкнуўся не столькі да скарэння спартыўных вяршынь, колькі да спазнання таго, якім чынам гэтыя вяршыні дасягаюцца. Якой павінна быць сістэма падрыхтоўкі будучага чэмпіёна, як лепш арганізаваць вучэбна-трэніровачны працэс, як правільна прадбачыць гранічныя нагрузкі на арганізм, каб ён не даваў збояў? Гэтыя і іншыя пытанні не давалі спакою Генадзю ў яго першых навуковых пошуках у галіне спорту вышэйшых дасягненняў. Ён іх не пакінуў і пасля заканчэння універсітэта. У роднай "альма-матэр" Нарскін амаль два дзесяцігоддзі адпрацаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам на кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту. Затым узначаліў кафедру аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры, якой аддаў сем гадоў, а бягучы навучальны год пачаў ужо на пасадзе дэкана факультэта фізічнай культуры.



Чвэрць стагоддзя былі напоўнены плённай выкладчыцкай і трэнерскай працай, навуковымі пошукамі. Генадзь Іванавіч падрыхтаваў майстра спорту міжнароднага класа і некалькіх майстроў спорту. Яго вучні не раз станавіліся чэмпіёнамі і прызёрамі многіх спаборніцтваў як у Беларусі, так і за яе межамі.

Г.І.Нарскін прымаў актыўны ўдзел у рабоце комплекснай навуковай групы па падрыхтоўцы зборнай каманды СССР па лёгкай атлетыцы. Вынікам гэтай работы стала не толькі паспяховае выступленне вядучых лёгкаатлетаў Саюза на міжнароднай арэне, але і абарона Генадзем Іванавічам кандыдацкай дысертацыі. Сем гадоў назад яму было прысвоена званне дацэнта.

Нарскін апублікаваў ужо каля 70 навуковых артыкулаў, пад яго асабістым кіраўніцтвам прайшла абарона чатырох кандыдацкіх дысертацый.

Але як бы высока не ўзнімаўся ён па лесвіцы славы і прызнання, ніколі не забываў і не забывае аб тых, хто настаўляў яго на шлях ісціны, дапамагаў у цяжкую хвіліну, быў побач на пэўных жыццёвых этапах.

— Я вельмі ўдзячны сваім школьным настаўнікам, — гаворыць Генадзь Іванавіч. – А асабліва класнаму кіраўніку Цярэнцію Пракопавічу Кажамякіну, які, не шкадуючы сіл і часу, сеяў добрае, разумнае і вечнае. Добра памятаю настаўнікаў фізічнай культуры Сямёна Уладзіміравіча Брыскіна і Уладзіміра Ціхавіча Васпухава. Урокі фізічнай культуры пад іх кіраўніцтвам заўсёды праходзілі цікава і жыва, яны вельмі многа далі вучням. Я ўдзячны лёсу, што ён звёў мяне з выдатным чалавекам, трэнерам, спецыялістам Аляксандрам Кузьмічом Чарнецкім, які навучыў мяне не толькі рыхтаваць спартсменаў высокага класа, але і чалавечым адносінам да вучняў, дабраце і патрабавальнасці.

У навукова-даследчай рабоце мне шмат дапамагалі намеснік дырэктара Усерасійскага навукова-даследчага інстытута фізічнай культуры, доктар педагагічных навук, прафесар Віктар Рыгоравіч Нікітушкін і мой навуковы кіраўнік доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр Іванавіч Палунін, які ў цяперашні час з'яўляецца старшым трэнерам зборнай Расіі па лёгкай атлетыцы.

— Сёння сваю задачу я бачу ў тым, — працягвае Г.І.Нарскін, — каб, па-першае, стварыць баяздольны калектыў выкладчыкаў, калектыў аднадумцаў, які мог бы вырашаць вялікія задачы ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў фізічнай культуры, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спартсменаў. Плануецца расшырэнне і паглыбленне навуковых даследаванняў, актыўная работа аспірантуры, узняцце на новы ўзровень усёй навукова-даследчай работы. Пакуль на новай пасадзе працую толькі некалькі месяцаў, але штосьці ўжо ўдалося палепшыць, змяніць.

Будзем удасканальваць работу і далей. Бо наш факультэт – гэта своеасаблівая спартыўная міні-ВНУ ў вобласці, асноўная кузня не толькі спецыялістаў фізічнай культуры і спорту, але і атлетаў высокага класа.

Да гэтага застаецца дадаць, што Г.І.Нарскін – трэці спецыяліст фізічнай культуры за ўсю гісторыю спорту на Гомельшчыне, якому прысвоена ганаровае званне. Першым быў загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту БІІЧТу Пётр Злотнікаў, другім – алімпійскі чэмпіён Леанід Гейштар.

**Віктар МАРЧАНКА,**
**ст.выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**

**Абмеркавана на прафкоме**

# ХТО ЯКІ ГАСПАДАР?



Сёння многія з нас з'яўляюцца дачнікамі. Але, на жаль, не ў самым прамым разуменні слова. Уладальнік 6 ці 10 сотак зямлі, якія знаходзяцца часта нават не каля рэчкі ці прыгожага сасновага бору, не можа па-сапраўднаму адчуць асалоду ад прыемнага адпачынку на ўлонні прыроды. Аб ім застаецца толькі марыць, бо выдзеленыя людзям кавалкі зямлі сталі для іх крыніцай выжывання, а не адпачынку. Аддаючы свае выхадныя дні з ранняй вясны да позняй восені, летнія водпускі, шчыруюць як мурашы на сваіх дзялянках людзі, каб забяспечыць сабе вітамінны рацыён на зіму.

Шмат дачнікаў ёсць і ў нашым універсітэце. Аб цяперашніх іх надзённых праблемах і клопатах ішла размова на апошнім пасяджэнні прафсаюзнага камітэта ГДУ. Былі заслуханы справаздачы старшынь садаводча-агародных таварыстваў "Сосны" (В.С.Генаш), "Каравышань" (В.З.Марчанка) і "Ландыш" (В.І.Жулькоў).

САТ "Сосны" знаходзіцца ў Веткаўскім раёне. Быў арганізаваны яшчэ задоўга да сумных чарнобыльскіх падзей, пасля якіх дачныя ўчасткі апынуліся ў зоне з павышаным радыяцыйным фонам. Таму члены кааператыва вызвалены ад падаткаў на апрацоўваемую зямлю, з іх бярэцца плата толькі за дарогі агульнага карыстання. Ёсць тут тэлефон, дастаўляецца прыродны газ, заасфальтаваны пад'езды да таварыства. Шмат маральных сіл давялося прыкласці новаму старшыні САТ В.С.Генаш, бо заставаліся тут нявырашанымі пытанні фінансавага плану: былі вялікія даўгі па аплаце за электраэнергію, многія члены кааператыва гадамі не плацілі падаткі. А самая набалелая праблема на сённяшні дзень — участкі, якія ўжо даўно не апрацоўваюцца і насенне пустазелля з іх шчодра сеецца да суседзяў, што выклікае іх справядлівае абурэнне. Уладальнікамі запушчаных участкаў з'яўляюцца Шалухіна, Быхаўцаў, Пятрышчанка, Рамаaccount Раманоўскі і інш., папярэдні старшыня САТ Цурганаў з'яўляецца ўладальнікам адразу чатырох надзелаў. Факт прыватызацыі дачных участкаў не дае ім права не паважаць і захоўваць інтарэсы астатніх членаў кааператыва.

Аб гэтым ішла размова на пасяджэнні прафкома. Такая ж праблема існуе і ў іншых дачных кааператывах, напрыклад, у каравышаньскім. Тут не апрацоўваюць зямлю некалькі гадоў запар Шарэнда, Гумен, Паташэнка.

Зразумела, што не ўсім цяпер хапае часу, сіл, сродкаў, а іншы раз і здароўя для падтрымання сваіх участкаў у належным стане. Ды і простыя арыфметычныя падлікі затрат на ўтрыманне зямельнага надзелу выклікаюць толькі горкі ўздых і расчараванне. Гэтым у многім можна растлумачыць факты запусцення многіх участкаў. Аднак пры любых акалічнасцях нельга дапускаць такой безгаспадарчасці.

Ёсць шмат сярод універсітэцкіх работнікаў і сапраўдных, дбайных гаспадароў, чые надзелы радуюць вока, з якіх атрымліваюць выдатныя ўраджаі садавіны, гародніны, бульбы. Тут міжволі прыгадваецца прымаўка: "Узяўся за гуж, не гавары што не дзюж".

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**
аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
— эканамічнай інфарматыкі і АСК – дацэнта;
— агульнай фізікі – прафесара, дацэнта;
— оптыкі – дацэнта;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту – выкладчыка;
— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры – дацэнта.
Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.
Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.
**РЭКТАРАТ.**

# З ТЭХНІЧНАЙ ТВОРЧАСЦЮ – У XXI СТАГОДДЗЕ



**На фізічным факультэце нашага універсітэта існуе адзіная ў Беларусі (а, бадай, і ва ўсім былым Саюзе) спецыяльнасць "Фізіка і тэхнічная творчасць" (афіцыйная назва "Фізіка" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць").**

**Сёлета быў першы выпуск спецыялістаў з кваліфікацыяй "Настаўнік фізікі. Педагог-арганізатар тэхнічнай творчасці", а 10 гадоў таму назад упершыню адбыўся прыём студэнтаў на тады яшчэ спецыялізацыю ФТТ.**

За прайшоўшы час спецыяльнасць узмацнела, з'явіліся знешнія сувязі з установамі дзіцячай тэхнічнай творчасці. У прыватнасці, заключаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж ГДУ і абласным Цэнтрам тэхнічнай творчасці навучэнцаў (АЦТТН), які з'яўляецца не дэкларацыяй, а кіруючым дакументам па рэальнай рабоце выкладчыкаў і студэнтаў спецыяльнасці.

У 1999 годзе супалі два 70-гадовыя юбілеі: нашай ВНУ і дзіцячай тэхнічнай творчасці ў Беларусі. Спецыяльнасць ФТТ самым непасрэдным чынам належыць да гэтых падзей, што праявілася ў яе актыўнай рабоце ў 1999-2000 навучальным годзе. Летась у верасні сярод студэнтаў спецыяльнасці было праведзена першынство па радыёарыентаванню ("паляванне на "ліс"). У сонечны дзень каля 20 студэнтаў старэйшых курсаў сабраліся ў маляўнічым лесе ў раёне Добруша, дзе і былі арганізаваны тры забегі па пошуку 5-ці паперамення працуючых радыёперадатчыкаў з дапамогай спецыяльных радыёпеленгатараў.

У пачатку кастрычніка спецыяльнасць была прадстаўлена шэрагам канструкцый, распрацовак творчых клубаў "Электроніка" і "Мадэліст-канструктар" на выстаўцы, прысвечанай юбілею універсітэта. У лістападзе, у рамках дагавора аб супрацоўніцтве паміж ГДУ і АЦТТН, ва універсітэце быў праведзены абласны семінар па падрыхтоўцы і правядзенню абласнога конкурсу па навукова-тэхнічнай творчасці сярод навучэнцаў, на якім абмяркоўвалася структура конкурсу і "Палажэнне аб конкурсе". Такія конкурсы ў рэспубліцы не праходзілі, і намечанае на сакавік 2000г. яго правядзенне павінна было стаць першым "блінам" ў развіцці гэтага накірунку. У "Палажэнні" прадугледжваліся два туры: "вольная праграма" – абарона ўласных канструкцый удзельнікаў конкурсу, і "абавязковая праграма" – творчае рашэнне заданняў па прапанаваных тэматыках. Распрацоўка структуры конкурсу і "Палажэння" праводзіліся ў актыўным супрацоўніцтве АЦТТН (дырэктар М.А.Мацвейчаў) і выкладчыкаў кафедры агульнай фізікі У.А.Замятніна і І.М.Якаўцава.

У лютым у АЦТТН адбыўся традыцыйны абласны конкурс па радыёканструяванню, заданні па тэарэтычным туры якога былі распрацаваны ў творчым клубе "Электроніка" ГДУ. У рабоце журы конкурсу прынялі ўдзел кіраўнік і члены клуба: І.М.Якаўцаў і студэнты Алег Хадасок, Аляксей Сядой (пераможца такога ж конкурсу 1999 г.) А 17-19 сакавіка, як і было намечана, ва універсітэце прайшоў абласны конкурс па навукова-тэхнічнай творчасці сярод навучэнцаў. Журы складалася ў асноўным з выкладчыкаў фізічнага факультэта: старшыня – заг.кафедры агульнай фізікі прафесар І.В.Семчанка, члены журы дацэнты У.Ф. Шолах, С.А.Хахомаў, Г.М.Гадлеўская, ст.выкладчыкі У.І.Кандраценка,У.А.Замятнін, І.М.Якаўцаў, студэнты В.Марозаў і А.Хадасок. Вынікі конкурсу былі падведзены як у камандным, так і ў асабістым заліку. Пераможцы ў асабістым заліку, акрамя прызоў, прадстаўленных камітэтам па справах моладзі, былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі і камітэта па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, нашага універсітэта. Трэба спадзявацца, што такія дакументы аб дасягненнях рабят будуць улічаны пры іх паступленні на спецыяльнасць "Фізіка і тэхнічная творчасць" у 2001 годзе.

У канцы сакавіка ў Мінску, у Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці навучэнцаў, былі падведзены вынікі выстаўкі, прысвечанай 70-годдзю дзіцячай тэхнічнай твочасці ў Беларусі, на якой ГДУ быў прадстаўлены некалькімі работамі студэнцкага творчага клуба "Электроніка". Студэнцкі калектыў быў адзначаны Дыпломам I ступені, а адна з канструкцый (аўтар Віталь Шарамет) – Дыпломам II ступені Міністэрства адукацыі. А на вераснёўскім пасяджэнні Савета універсітэта названы клуб прадстаўлены на заахвочванне Саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за работу са здольнымі навучэнцамі і студэнтамі.

А з 12 па 30 красавіка бягучага года ў выставачнай зале ГДУ праходзіла абласная выстаўка дзіцячай тэхнічнай творчасці, прысвечаная 55-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, на якой было прадстаўлена звыш 400 экспанатаў ад усіх раёнаў. Акрамя школ і пазашкольных устаноў у ёй прынялі ўдзел клуб "Хобі", які прадставіў мадэлі ваеннай тэхнікі, і студэнцкія творчыя клубы "Электроніка" (кіраўнік – І.М.Якаўцаў) і "Мадэліст-канстуктар" (У.А.Замятнін). У афармленні раздзелаў клубаў актыўны ўдзел прынялі студэнты спецыяльнасці А.Хадасок, А.Каробкін, А.Брэдзіхін, А. Сядой, П.Бордак, С.Ноздрын і іншыя. Іх работы былі па вартасці ацэнены больш 100 запісамі ў Кнізе водгукаў раздзела ТК "Электроніка". Трэба адзначыць, што акрамя работ студэнтаў на выстаўцы былі прадстаўлены і вырабы іх выхаванцаў, гурткоў тэхнічнай творчасці, якія і ў цяперашні час вядуць студэнты спецыяльнасці ФТТ С.Ноздрын (АЦТТН) і В.Грышчанка (Дом дзіцячай творчасці Цэнтральнага раёна).

Выстаўка выклікала вялікую цікавасць не толькі школьнікаў і студэнтаў, але і спецыялістаў. Яе наведалі каля 10000 чалавек. Неабходна адзначыць вялікую работу ў яе арганізацыі і правядзенні дырэктара АЦТТН М.А.Мацвеічава, супрацоўнікаў цэнтра, гарадской станцыі юных тэхнікаў (дырэктар М.М.Бельчыкаў), актыўны ўдзел Рагачоўскага і Мазырскага цэнтраў тэхнічнай творчасці навучэнцаў, Добрушскай, Светлагорскай, Калінкавіцкай, Рэчыцкай станцый юных тэхнікаў.

Выстаўка, несумненна, з'явілася падзеяй у нашай вобласці. У перыяд яе правядзення на базе універсітэта прайшоў міжабласны семінар па праблемах падрыхтоўкі кадраў па дзіцячай тэхнічнай творчасці, у якім прынялі ўдзел дырэктар Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў В.І.Цвірко, прадстаўнікі Брэсцкай вобласці, раённых і гарадскіх пазашкольных устаноў Гомельшчыны. У іх выступленнях, акрамя адабрэння актыўнага супрацоўніцтва ГДУ і АЦТТН, быў выказаны шэраг канструктыўных прапаноў па ўмацаванню спецыяльнасці "Фізіка і тэхнічная творчасць", як "кузні кадраў" для пазашкольных устаноў не толькі Гомельскай вобласці, але і рэспублікі. Асобна быў адзначаны ўдзел студэнтаў спецыяльнасці ў спаборніцтвах па тэхнічнай творчасці ў складзе незалежных суддзейскіх брыгад і каменданцкіх каманд. Гэта цяперашнія выпускнікі спецыяльнасці У.Марозаў, А.Самафалаў, А.Нікіцюк, С.Клячкоў, І.Замятнін, А.Хадасок, М.Філіпаў, А.Дроганаў, студэнты А.Каробкін, Г.Кавалюк, А.Кабаеў, А.Цеплякоў, А.Сычоў, А.Балоцкі, А.Яшчанка, Д.Чвалаў, А.Вялько, С.Ноздрын, І.Бейзераў, А.Адзінцоў, А.Сядой, П.Бордак, А.Брэдзіхін і інш.

У чэрвені для студэнтаў наступае гарачая пара – сесія. І тым не менш чацвёра студэнтаў 4 курса спецыяльнасці ФТТ сумяшчалі гэты напружаны час з работай у дзіцячым лагеры "Лясная казка" у Чонках. Тут быў арганізаваны атрад юных тэхнікаў, выхавацелямі ў якім працавалі студэнты А.Яшчанка і А.Каробкін, а Г.Кавалюк вёў папулярны гурток па радыёарыентаванню. Дарэчы, яго работа вялася на працягу ўсіх змен лагера (кіраўнікі А.Хадасок (II змена) і А.Каробкін (III змена). У тым жа месяцы, калі ў лагеры быў "тэхнічны дэсант", АЦТТН правёў там паказальныя выступленні па аўтамадэльным і суднамадэльным спорце, у якіх прынялі ўдзел рабяты з "лагернага" суднамадэльнага гуртка пад кіраўніцтвам С.Ноздрына. Таксама тут была праведзена выязная выстаўка тэхнічнай творчасці з дэманстрацыяй некаторых канструкцый і студэнцкага творчага клуба "Электроніка".

Вельмі цікава прайшла абарона дыпломных праектаў выпускнікоў спецыяльнасці ФТТ. На ёй будучыя спецыялісты абаранялі ўласныя распрацоўкі, у асноўным у дзеючым выглядзе. А адна з дыпломных работ была прадстаўлена трыма відэафільмамі (цудоўна зманціраванымі і агучанымі аўтарам В.Аўсеенкам), адлюстроўваючымі работу спецыяльнасці ФТТ, кафедры агульнай фізікі і праблемнай лабараторыі ГДУ.

Выпускнікі спецыяльнасці У.Марозаў, А.Самафалаў атрымалі дыпломы з адзнакай і накіраванні ў аспірантуру. Алег Хадасок прыняты на працу ў абласны Цэнтр тэхнічнай творчасці навучэнцаў загадчыкам аддзела навукова-тэхнічнай творчасці, што, несумненна, яшчэ больш умацуе сувязі і пашырыць плённае супрацоўніцтва паміж ГДУ і АЦТТН.

***Кандыдат на Дзяржаўную прэмію***

# АБ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ

Для студэнтаў 1-га курса філалагічнага факультэта была наладжана сустрэча з беларускім пісьменнікам Анатолем Бароўскім. Тэмай размовы стала абмеркаванне кнігі "Чорны бусел – белы цень", якая вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя К.Каліноўскага. Твор выйшаў у свет у 1997 годзе, з'яўляецца дакументальным аповедам пра трагедыю 1986г. і сёння заклікае не забываць пра чарнобыльскую бяду. У свой час аўтар, працуючы журналістам, бываў і каля самога рэактара, і ў адселеных вёсках, а напісаў кнігу пра ліквідатараў – людзей мужных, адданых і верных Радзіме, многіх з якіх ужо, на вялікі жаль, няма сярод нас: Чарнобыль патрохі робіць сваю чорную справу. "Чарнобыль, Чарнобыль... Балючай стрэмкай сядзіш ты ў маім сэрцы, неадчэпны ў памяці, у сны прыходзіш, нараджаеш сум і трывогу, слёзы..."

Сама кніга, як расказаў А.Бароўскі, не была чымсьці запланаваным, да яе напісання пісьменніка прывяло само жыццё. Пра свой твор гаварыў не толькі аўтар. Чарнобыльская катастрофа, як высветлілася, хвалюе і маладое пакаленне. Студэнтам кніга вядома, і некаторыя адзначылі, што "Чорны бусел – белы цень" сцірае межы гадоў, набліжае да бяды, якая стала бядою жыццяў энергетыкаў і бядою ўсёй Беларусі.

Размова пра кнігу атрымалася цікавай, яна нагадала нечым чытацкую канферэнцыю. Сваімі ўражаннямі пра яе падзяліліся таксама старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Васіль Ткачоў, кандыдат філалагічных навук Сяргей Ханеня і доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры Іван Штэйнер, які і падсумаваў вынікі сустрэчы.

**Таццяна ЛОЗКА,**
**студэнтка 1-га курса філфака.**

***Прадстаўніца новай спецыялізацыі***

# ЯЕ МАРА – ЖУРНАЛІСТЫКА



"Родная мова – наш самы вялікі скарб" – менавіта такі дэвіз выбрала для сябе выпускніца гэтага года Пераростаўскай сярэдняй школы Добрушскага раёна Анастасія Бараш. Скончыўшы літаратурны клас з сярэбраным медалём, яна (дарэчы, лепшая вучаніца школы, сакратар пярвічнай арганізацыі БПСМ) вырашыла звязаць сваё жыццё з працай настаўніка. Як прызналася сама Анастасія, запаветнай яе марай была журналістыка. Таму, даведаўшыся аб адкрыцці такой спецыялізацыі на філалагічным факультэце ГДУ імя Ф.Скарыны, дзяўчына спыніла свой выбар менавіта на гэтай ВНУ.

Зараз Анастасія Бараш – студэнтка першага курса ГДУ філалагічнага факультэта са спецыялізацыяй "Літаратурная праца ў газетах і часопісах".

*– Як толькі я, яшчэ да паступлення, пабывала на філфаку ГДУ, адразу зразумела, што гэта – маё, – гаворыць дзяўчына.*

**Што ж, пажадаем Анастасіі поспехаў у вучобе, а беларускай прэсе – творчых маладых высокаадукаваных журналістаў.**

**Сяргей АРЦЁМАЎ,**
**студэнт 3-га курса філалагічнага факультэта.**

**У мэтах далейшага ўдасканальвання падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй без адрыву ад вытворчасці на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 1993 года ў нашым універсітэце быў створаны факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Летась у снежні ён пераўтвораны ў Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. З яго дырэктарам, прарэктарам па вучэбнай рабоце універсітэта дацэнтам А.А.Малахавым сустрэўся наш карэспандэнт і папрасіў адказаць на пытанні, якія цікавяць чытачоў газеты.**

# ДВА ДЫПЛОМЫ – ЗА АДЗІН ТЭРМІН НАВУЧАННЯ

***– Алег Аляксеевіч, перш за ўсё скажыце аб прызначэнні новага структурнага падраздзялення універсітэта.***

– Інстытут з'яўляецца навучальнай установай, якая ажыццяўляе вучэбную, навуковую і арганізацыйна-метадычную работу па павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў работнікаў і спецыялістаў для Гомельскага рэгіёна, а таксама вучэбна-метадычным, інфармацыйным і кансалцінгавым цэнтрам па вывучэнню і прапагандзе дасягненняў навукі, тэхнікі і перадавога айчыннага і замежнага вопыту арганізацыі вытворчасці.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці інстытута сталі: задавальненне патрэб міністэрстваў, ведамстваў, аб'яднанняў і прадпрыемстваў у падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў, стажыроўцы работнікаў і спецыялістаў; пашырэнне і паглыбленне прафесійных ведаў і ўдасканальванне дзелавых якасцей кіруючых работнікаў і спецыялістаў на аснове вывучэння дзейнічаючага заканадаўства, эканамічнай палітыкі рынachных адносін, сумесных метадаў кіравання вытворчасцю, навуковай арганізацыі працы і кіравання з прымяненнем электронна-вылічальнай тэхнікі, сродкаў аўтаматызацыі і механізацыі вытворчых працэсаў і шырокага абмену сучасным навуковым і вытворча-тэхнічным вопытам. Самая сур'ёзная ўвага звяртаецца на пастаяннае паляпшэнне якасці навучання студэнтаў і слухачоў, узмацненне яе практычнай накіраванасці на рашэнне канкрэтных задач, удасканальванне работы галін, аб'яднанняў, прадпрыемстваў і працоўных калектываў. Адна з галоўных нашых задач – удасканальванне форм і метадаў правядзення вучэбных заняткаў, інтэнсіфікацыя вучэбна-дапаможнага працэсу, развіццё практыкі індывідуальнага навучання работнікаў і спецыялістаў, у тым ліку на аснове канкрэтных заданняў, зацверджаных кіраўнікамі міністэрстваў, ведамстваў, аб'яднанняў і прадпрыемстваў; забеспячэнне інтэграцыі адукацыі, навукі і вытворчасці, выкананне навуковых даследаванняў па актуальных праблемах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў. Больш актыўна мы будзем удзельнічаць у выкананні навукова-даследчых работ і іх укараненні па прамых дагаворах з міністэрствамі і прадпрыемствамі, у распрацоўцы дзяржаўных мэтавых навукова-даследчых праграм і планаў. У нашы абавязкі ўваходзіць таксама аказанне кансалцінгавых паслуг, метадычнай, інфармацыйнай і іншай адукацыйнай дапамогі міністэрствам, ведамствам, аб'яднанням, прадпрыемствам і фізічным асобам. Адначасова павінны дамагацца павышэння кваліфікацыі ўласнага прафесарска-выкладчыцкага складу, іх педагагічнага і агульна-культурнага ўзроўню.

Указаная дзейнасць мае важную сацыяльную функцыю яшчэ і ў тым, што садзейнічае перападрыхтоўцы незанятага насельніцтва, адаптацыі кожнага, хто навучаецца, да сацыяльна-эканамічных умоў сучаснага развіцця краіны, росту прафесійнага майстэрства.

***– Хто з'яўляецца вашымі навучэнцамі?***

– Студэнтамі і слухачамі інстытута становяцца кіруючыя работнікі і спецыялісты народнай гаспадаркі, фізічныя асобы, якія маюць вышэйшую, сярэднюю спецыяльную і агульную сярэднюю адукацыю, а таксама асобы, якія накіроўваюцца на навучанне і перападрыхтоўку на дагаворнай аснове ад рэгіянальных цэнтраў занятасці і іншых прадпрыемстваў.

Асаблівае значэнне мае перападрыхтоўка асоб з вышэйшай адукацыяй, па спецыяльнасцях "Правазнаўства", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт", "Практычная псіхалогія". Навучанне ажыццяўляецца як па вочнай форме навучання (з 1 кастрычніка), так і па завочнай (тэрмін навучання – 2 гады). Так, спецыяльнасць "Практычная псіхалогія" у нас цяпер набываюць 140 слухачоў.

***– Ці могуць сённяшнія студэнты універсітэта паралельна з асноўнай набыць другую спецыяльнасць і за адзін тэрмін навучання атрымаць два паўнацэнныя дыпломы?***

– Могуць. У адпаведнасці з Палажэннем аб Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў яго слухачамі могуць залічвацца студэнты (па рэкамендацыях факультэтаў), якія паспяхова засвойваюць асноўную спецыяльнасць. У цяперашні час у ГДУ другую спецыяльнасць ("Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Практычная псіхалогія", "Лячэбная фізкультура і масаж") атрымліваюць многія студэнты. Прадугледжваецца і адкрыццё для трэцякурснікаў яшчэ адной дадатковай спецыяльнасці – "Правазнаўства" – пасля зімовай сесіі бягучага навучальнага года.

Вялікае распаўсюджанне атрымала індывідуальнае навучанне па спецыяльнасцях "Аператар персанальнай ЭВМ", "Камп'ютэрная вёрстка, графіка і дызайн".

Набыццё студэнтамі дадатковай спецыяльнасці – на платнай аснове.

Усе заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам нашага інстытута, праводзяцца на матэрыяльна-тэхнічнай базе універсітэта з выкарыстаннем вылічальнай тэхнікі і навейшых адукацыйных тэхналогій. Да навучальнага працэсу падключаны найбольш вопытныя вучоныя і выкладчыкі.

**Гутарку вёў Б.ВАЛОДЗІН.**

Прафком інфармуе

# КАБ АТРЫМАЦЬ КВАТЭРУ...

**Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.09.1999г. зацверджаны Правілы ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і выдзялення жылых памяшканняў.**

Правілы ўстанаўліваюць абавязковы для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый незалежна ад форм уласнасці парадак уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і выдзялення ім жылля. Дзяржаўныя арганізацыі забяспечваюць жыллём у адпаведнасці з Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь, дадзенымі Правіламі і калектыўнымі дагаворамі. Грамадскі кантроль за ўлікам грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, устаноўленнем чарговасці на атрыманне жылых памяшканняў, іх выдзяленнем, правільнасцю аднясення грамадзян да катэгорыі малазабяспечаных працаздольных або непрацаздольных грамадзян ажыццяўляецца грамадскімі камісіямі па жыллёвых пытаннях, створанымі пры мясцовых, выканаўчых і распарадчых органах, а таксама ў арганізацыях з удзелам прадстаўнікоў прафсаюзаў і працоўных калектываў.

Грамадзяне лічацца прынятымі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з дня падачы заявы з усімі неабходнымі дакументамі. Калі заявы пададзены некалькімі грамадзянамі ў адзін і той жа дзень, яны ўключаюцца ў спісы тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з улікам часу (гадзіны, мінуты падачы заявы з усімі неабходнымі дакументамі).

Заява рэгіструецца ў кнізе рэгістрацыі заяў грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і разглядаецца на працягу месяца з дня падачы ўсіх неабходных дакументаў. Аб прынятым рашэнні грамадзяніну паведамляецца ў дзесяцідзённы тэрмін у пісьмовай форме. У рашэнні ўказваецца дата і падстава прыняцця яго на ўлік, састаў яго сям'і, а пры адмове прыняцця на ўлік — яе прычына.

Адмова мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або адміністрацыі арганізацыі і прафсаюзнага камітэта ў прынядцці грамадзян на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў можа быць абскарджана ў судовым парадку.

Улік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ажыццяўляецца шляхам вядзення агульнага спіса. Малазабяспечаныя непрацаздольныя грамадзяне, а таксама тыя, хто мае права на атрыманне жылля сацыяльнага карыстання па-за чаргой, уключаюцца ў асобныя спісы.

На кожнага прынятага на ўлік заводзіцца ўліковая папка, у якой захоўваецца заява, акт абследавання жыллёвых умоў, выпіска з рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органаў або сумеснага рашэння адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта, а таксама іншыя матэрыялы, якія павінны быць улічаны ў вопісу дакументаў уліковай справы.

Новыя формы дакументаў для пастаноўкі на ўлік для атрымання жылля адлюстраваны ў Загадзе Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь ад 15 лістапада 1999 года: заява, даведка ЖБК і домакіраўніцтва аб займаемай плошчы з сям'ёй, даведка з БТІ аб знаходжанні ва ўласнасці іншых жыллёвых памяшканняў, даведка аб сукупным гадавым даходзе сям'і, даведка аб рэгістрацыі шлюбу або ўсынаўленні дзяцей без шлюбу.

Грамадзяне, якія стаяць на ўліку ў паляпшэнні жыллёвых умоў, абавязаны штогод абнаўляць даведкі ў асабістай справе аб займаемай жыллёвай плошчы, складзе сям'і і даведкі БТІ.

**Работнікам універсітэта, якія стаяць на чарзе на атрыманне жылля, неабходна абнавіць усе даведкі да 10 лістапада г.г., у адваротным выпадку яны будуць зняты з уліку на паляпшэнне жыллёвых умоў.**

**М.ФЯДОСЕНКА,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома ГДУ.**

спорт спорт спорт

## СЯРЭБРАНЫ МЕДАЛЬ Г.ГАЛАЎНЁВАЙ

У Анапе прайшоў чэмпіянат свету па паліатлону, які ў Беларусі назвалі шматбор'е "Здароўе".

Чатырохразовая чэмпіёнка свету па паліатлону, майстар спорту, выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта Галіна Галаўнёва заваявала сярэбраную ўзнагароду чэмпіянату.

Мы так ужо прывыклі да перамог Галіны Сямёнаўны, што сярэбраную ўзнагароду лічым як нязўдачу.

Але трэба заўважыць, што выступіць лепш не дазволіла хвароба пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў.

Будзем спадзявацца, што наша лепшая ў Беларусі шматборка яшчэ не раз парадуе аматараў спорту сваімі перамогамі.

**В.ЗАХАРАЎ.**

## ЧЭМПІЁНЫ!

На гомельскіх стадыёнах "Лакаматыў" і "Прамень" прайшлі заключныя гульні па футболу ў праграме круглагадовай спартакіяды ВНУ Беларусі. У фінале студэнты нашага універсітэта з лікам 3:0 перамаглі каманду Беларускай політэхнічнай акадэміі і сталі чэмпіёнамі. У гэтым вялікая заслуга іх трэнера — ст.выкладчыка кафедры спартыўных гульняў, майстра спорту У.І.Джыоева.

Нагадаем, што такога поспеху футбалісты ГДУ дабіліся пасля шматгадовага перапынку. Яны аказаліся мацнейшымі сярод 28 студэнцкіх каманд, якія ўдзельнічалі ў чэмпіянаце.

**Б.ГІЛЬ,**
**дырэктар спартклуба.**

Да ўвагі будучых пенсіянераў

# АБ ПЕРСАНІФІЦЫРАВАНЫМ УЛІКУ

Індывідуальны (персаніфіцыраваны) улік у сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання — гэта арганізацыя і вядзенне ўліку звестак аб кожнай застрахаванай асобе з мэтай дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

З 1 студзеня 2001 года на тэрыторыі г.Гомеля (Цэнтральны раён), г.Жлобіна і Жлобінскага раёна ўступае ў сілу Закон Рэспублікі Беларусь "Аб індывідуальным (персаніфіцыраваным) уліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання", а з 1 студзеня 2003 года яго дзеянне распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю рэспублікі.

Мэта ўвядзення персаніфіцыраванага ўліку — стварыць умовы для прызначэння пенсіі кожнаму грамадзяніну ў адпаведнасці з вынікамі яго працы на працягу ўсёй яго працоўнай дзейнасці.

***— Якія прычыны яго арганізацыі?***

— Ва ўмовах рыначнай экономікі банкрутва, рэарганізацыя прадпрыемстваў сталі насіць масавы характар. Пры гэтым часта не захоўваюцца архівы, на аснове звестак якіх можа быць пацверджаны працоўны стаж і заработак для прызначэння дзяржаўнай пенсіі.

Звесткі, якія ўтрымліваюцца ў працоўных кніжках і даведках аб заработку, сталі менш дакладнымі, чым яшчэ дзесяць гадоў назад. Вось і атрымліваюць некаторыя нашы грамадзяне не зусім заслужаную пенсію, забіраючы сродкі тых, хто не зарабіў сумленна.

Памер пенсіі не адлюстроўвае індывідуальнага ўкладу кожнага працуючага ў сістэму сацыяльнага страхавання на працягу ўсёй працоўнай дзейнасці.

***— Што сабою ўяўляе персаніфіцыраваны ўлік і ў чым яго перавагі?***

— Замест практыкі, пры якой пенсія прызначаецца па даведцы аб заработнай плаце і звестках з працоўнай кніжкі, прыходзіць сістэма персаніфіцыраванага ўліку, якая з'яўляецца інфармацыйнай базай, дзе будуць накопліваюцца звесткі, неабходныя для прызначэння пенсіі. У перспектыве дадзеныя персаніфіцыраванага ўліку будуць выкарыстоўвацца і для прызначэння дапамог (па часовай непрацаздольнасці, па беспрацоўю). Кожны працоўны грамадзянін будзе зарэгістраваны ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва (далей — Фонд), яму выдадуць пасведчанне сацыяльнага страхавання з указаннем страхавога нумара, які адпавядае асабістаму нумару грамадзяніна, указанаму ў пашпарце новага ўзору. Таму рэкамендуем, хто яшчэ не зрабіў, **неадкладна абмяняць пашпарт старога ўзору на новы.**

Пад страхавым нумарам на яго адкрыюць у інфармацыйнай базе Фонда індывідуальны асабовы рахунак, на якім будуць накоплівацца ўсе звесткі аб стажы, заработку і іншыя дадзеныя, неабходныя яму ў будучым для прызначэння працоўнай пенсіі.

Сістэма ўліку такая, што страхавы нумар захоўваецца за чалавекам усё жыццё. Куды б ён не пераехаў, на якую б працу не ўладкаваўся, — дадзеныя аб ім будуць пападаць на адзін і той жа асабовы рахунак.

Да моманту прызначэння пенсіі не трэба будзе грамадзяніну збіраць шматлікія даведкі, шукаць зніклыя фірмы, дзе ён калісьці працаваў, корпацца ў архівах. Усе звесткі будуць захоўвацца ў камп'ютэрным банку дадзеных Фонду.

Дадзеныя персаніфіцыраванага ўліку знаходзяцца ў дзяржаўным органе — Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва, такім чынам дзяржава забяспечвае захаванасць, дакладнасць і канфідэнцыяльнасць звестак аб кожным грамадзяніне.

***— Што дае персаніфіцыраваны ўлік?***

— Асноўная задача персаніфіцыраванага ўліку — зрабіць сістэму дзяржаўнага сацыяльнага страхавання справядлівай, максімальна абараніць пенсіённыя правы працуючых грамадзян, выключыць неапраўданае расходаванне сродкаў сацыяльнага страхавання на выплату "незаробленых" пенсій.

Персаніфіцыраваны ўлік палепшыць фінансавае становішча ў дзяржаўным сацыяльным страхаванні за кошт павышэння зацікаўленасці непасрэдна работніка ў правільным адлюстраванні заработку пры налічэнні страхавых узносаў і поўным іх пералічэнні і створыць інфармацыйную базу для рэформ у сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, у прыватнасці, у пенсіённай сістэме.

***— На што трэба звярнуць увагу?***

— Пры сённяшняй сістэме сацыяльнай салідарнасці пакаленняў (іншымі словамі, пры пераразмеркаванні сродкаў ад працуючых да непрацуючых) персаніфіцыраваны ўлік дазволіць забяспечыць збор і захаванне дакладнай інфармацыі аб страхавым стажы кожнага працуючага грамадзяніна, аб заробтку ці даходзе за ўвесь гэты перыяд, аб налічаных страхавых узносах і накапленне іншай інфармацыі, неабходнай для прызначэння пенсіі.

Персаніфіцыраваны ўлік дазволіць у далейшым пры неабходнасці забяспечыць функцыяніраванне накапляльнай сістэмы і ўлік ужо не толькі інфармацыі аб працоўных грамадзянах, але і сум, якія накопліваюцца на рахунках кожнага застрахаванага грамадзяніна. Калі не пачаць персаніфіцыраваны ўлік сёння, то рэформы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, у прыватнасці, сістэмы пенсіённага забеспячэння, будуць проста немагчымы.

**Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.**

*МИР ЦВЕТОВ — МИР ПРЕКРАСНОГО*



# БАРХАТЦЫ

Свое название эти растения получили из-за бархатистого отлива лепестков пестичных цветков, окружающих трубчатые цветки в соцветии корзинка. Ботаническое название — тагетесы, в быту их ласково зовут шапочки, чернобривцы. Дико они растут в Америке — от Южной Аризоны и Западного Техаса до Аргентины. В культуре широко распространены три их вида: бархатцы прямостоячие высотой до 80 см, бархатцы отклоненные до 50 см и бархатцы тонколистные — не выше 30 см. Цветут они обильно с июня до заморозков. Соцветия тагетесов снизу окружены оберткой. На ней так же как и на листьях имеются железки, выделяющие специфический острый запах. Форму соцветия определяет количество и форма отгиба краевых пестичных цветков. Если их много и они маскируют центральные трубчатые цветки, соцветие напоминает шапочку, цветы хризантемы или гвоздики. Окраска лепестков варьирует от нежно-салатовой, золотисто-желтой, оранжевой до темнокоричневой со всевозможными переходами оттенков, полосками, штрихами, крапинками. Одно из последних достижений селекционеров — изысканные тагетесы с кремово-белыми соцветиями диаметром до 8 см.

Тагетесы — одни из самых неприхотливых и популярных в озеленении цветов. Они украшают основную массу клумб. И хотя на парадных местах высаживают более дорогие цветы, бархатцы незаменимы, когда требуется создать дополнительные яркие цветовые акценты. Средневысокие и карликовые сорта бархатцев прекрасно подходят для бордюров на газонах. В балконных ящиках яркие цвета бархатцев скрашивают монотонность бетонных конструкций. Обильное цветение на солнечных и затененных участках делает бархатцы незаменимыми в самых посещаемых и оживленных местах. Теплые тона их лепестков оказывают бодрящее действие и несут заряд хорошего настроения. Тагетесы учат стойко переносить непогоду. Лишь стряхнут со своих бархатистых лепестков капли холодного осеннего дождя и опять оптимистично и радостно смотрят на окружающих, утверждая непобедимую жизнестойкость. Летом золотисто-оранжевые тона массивов тагетесов ассоциируются с цветом неба заходящего солнца, осенью — с желтой листвой на деревьях.

В срезке тагетесы хорошо смотрятся в сочетании с мелкоцветными хризантемами синих оттенков, с оранжировочной зеленью, в керамических и стеклянных вазах.

Незаменимы тагетесы на дачных и приусадебных участках. Они не только украшают клумбы, дорожки, маскируют хозяйственные постройки, заборы, но и обеззараживают почву от вредителей многих культур — нематод. С культурой этих неприхотливых цветов могут справиться даже дети. В итоге они весь сезон проведут в жизнерадостной компании тагетесов и получат первые навыки искусства украшать Землю цветами.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ
Падпісана да друку 20.10.2000